**ПАВЕ́ТРЫКІ**, ліхія духі, якія заўсёды трымаюцца вялікім гуртам у глухіх мясцінах над багнаю. Прылятаюць яны ці з нябесных вышынь, ці з далёкіх чужаземных краёў, ці з глыбіні балот. Спецыяльна П. не шукаюць ахвяр, а, падхопленыя ветрам падчас сваіх чартоўскіх пацех, нясуцца, пакуль не закрануць выпадковага чалавека, на якога яны накідваюцца і пачынаюць яго губіць. Але чалавек можа адчуваць сябе ў бяспецы нават знаходзячыся паблізу ад П., калі вецер мае супрацьлеглы напрамак. Адзін П. вельмі слабы, і таму дзейнічаюць яны толькі разам.

*Літ.*: Никифоровский Н.Я. Нечистики, свод простонародных в Витебской Белоруссии сказаний о нечистой силе. Витебск, 1995.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ